**Алена Сяргееўна Цялькова (1944), спявачка, народная артыстка Беларусі, мастацкі кіраўнік фальклорнай групы «Купалінка»**
**Беларускай дзяржаўнай філармоніі**



Алена Сяргееўна Цялькова нарадзілася 7 мая 1944 года ў горадзе Пінску (цяпер у Брэсцкай вобласці).

У 1970 годзе скончыла Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі. Валодае сапрана, голасам сакавітага тэмбру, шырокім пеўчым дыяпазонам. З 1966 года – салістка жаночага вакальнага квартэта «Купалінка». Квартэт «Купалінка» стаў прызнаным майстрам вакальнай культуры, лаўрэатам усесаюзных і міжнародных конкурсаў і фестываляў, уладальнікам залатых медалёў. У пошуку новых творчых магчымасцей Алена Цялькова ў 1986 годзе прынцыпова змяніла аблічча «Купалінкі», узяла за аснову болей свабодную форму выканання, спалучаючы змешаны спеў з інструментальным суправаджэннем. Адметнай рысай ансамбля сталі яркая сцэнічная форма, рух да мастацкага ўдасканальвання і паглыбленне ў сутнасць народнай традыцыі. «Фальклор не павінен пахнуць нафталінам, – лічыць А. С. Цялькова. – Гэты жанр павінен развівацца, рухацца наперад».

З 1988 года А. С. Цялькова – адна са стваральніц, мастацкі кіраўнік і салістка фальклорнай групы. Яна адраджае традыцыі беларускага музычна-песеннага мастацтва, збірае беларускі народны песенны фальклор, які ў рэпертуары групы выконваецца ў рэгіянальных традыцыях спеваў (пераважна Мінскага, Брэсцкага і Гомельскага раёнаў).

Алена Цялькова была ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ, дыпломам лаўрэата прэміі ЛКСМБ, Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БСССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага савета Таджыцкай ССР, нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровым знакам Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, медалём «Ветэран працы».

У 1991 годзе А. С. Цяльковай прысвоена званне «Заслужаная артыстка Беларусі». А ў 2012 годзе мастацкаму кіраўніку фальклорнай групы «Купалінка» Алене Цяльковай прысвоена ганаровае званне «Народны артыст Беларусі».

Сёння фальклорная група «Купалінка» працуе ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі і бліскуча прадстаўляе нацыянальнае мастацтва ў Беларусі. Пад кіраўніцтвам Алены Цяльковай "Купалінка" неаднаразова станавілася лаўрэатам міжнародных конкурсаў і фестываляў, уладальнікам залатых медалёў. Калектыў прадстаўляе нацыянальную культуру Беларусі па

ўсім свеце - у Расіі, краінах Балтыі, Канадзе, Германіі, Бельгіі, Францыі, Італіі, Вялікабрытаніі, Швейцарыі, Балгарыі, Аўстрыі, Індыі, Японіі і інш. Ансамблю неаднаразова ўручаліся каштоўныя ўзнагароды: залаты медаль Міжнароднага конкурсу ў Сафіі, яны двойчы сталі лаўрэатамі першай прэміі на «Міжнародным конкурсе» ў Карэі. У водгуках нацыянальнага і зарубежнага друку, а таксама ў адзнаках знаўцаў фальклору і сцэны «Купалінка» з’яўляецца «лепшым паслом беларускай культуры і багатых беларускіх традыцый». Французскай фірмай АКВ быў выпушчаны кампакт-дыск «Бал земли Белорусской». Сваёй творчасцю «Купалінка» захоўвае, адраджае і папулярызуе традыцыі і звычаі беларускага народа, дапамагае ўстанаўленню сяброўскіх сувязей паміж народамі ўсяго свету. За шматгадовую творчую дзейнасць, захаванне традыцый нацыянальнай культуры, прапаганду беларускага мастацтва фальклёрны гурт "Купалінка" пад кіраўніцтвам Алены Цяльковай удастоены звання «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь».

Выступленні ў якасці спявачкі А. С. Цялькова пакінула толькі некалькі гадоў назад. Яна – аўтар музычных кампазіцый «Купалле», «На кірмашы», «Прыйдзі, вясна», апрацовак беларускіх народных песень. Адна з аўтараў кінафільмаў «Квартэт “Купалінка”», «Спявае “Купалінка”», «Купалінка».


1. **Цялькова Алена Сяргееўна** / І. Л. Чэбан // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 2003. Т. 17. С. 193.
2. **Ускова, Т.** Алена Цялькова: “Здзіўляць, хваляваць, каб сэрца білася часцей” / Таццяна Ускова // Сельская газета. 2011. 12 марта.
3. **«Купалінкі»** пачуўшы галасы : гурт народнай песні “Купалінка” пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі // Беларуская думка. 2006. № 6. С. 130–132.
4. **О присвоении** тт. Богданову Н. А., Тельковой Е. С., Тихевичу В. П. почётного звания «Заслуженный артист Республики Беларусь» : Указ Президиума Верховного Совета Республики Беларусь от 2 декабря 1991 г. № 1263-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991 г., № 36, ст. 639.
5. Официальный сайт: **www.kupalinka-folk.com**
6. **Государственных** наград Беларуси удостоена большая группа работников различных сфер: [почетное звание «Народный артист Беларуси» присвоено художественному руководителю фольклорной группы «Купалинка» Елене Тельковой]. – Режим доступа: http://www.open.by/country/.
7. **Елена Телькова:** «В России “Купалинку” принимают с огромным радушием». – Режим доступа: http://www.soyuz.by.
8. **«Купалинка»** покорила Таллинн. – Режим доступа: http://www.stolitsa.ee/news.

9. **Фольклорная** группа «Купалинка»: [ художественный руководитель – заслуженная артистка Республики Беларусь Елена Телькова]. – Режим доступа: http://afisha.sb.by.
10. **Ансамбль** «Купалинка». – Режим доступа: http://ravina.by/ansambl-kupalinka.